**Дзянісаў, М.** Усход – справа тонкая / М. Дзянісаў // Браслаўская звязда. — 2010. — 13 лют. — С. 2, 6.

## УСХОД – СПРАВА ТОНКАЯ



Горы Гіндукуш на Паўночным усходзе Афганістана – месца, як кажуць у народзе, гіблае. Вакол скалы, расліннасці няма, у кропцы Пашар на вышыні 3500 м над узроўнем мора холадна, асабліва ноччу. Да граніцы з Пакістанам 7 км, да сваіх ніякай дарогі няма. Харчы і боепрыпасы для 70 байцоў Савецкай Арміі дастаўляюцца толькі верталётам. Менавіта сюды трапіў пасля пачатковай ваеннай падрыхтоўкі малады салдат, наш зямляк з в. Адамянішкі Пётр Кумпінь.

Змяняючыся праз 8 гадзін, частка байцоў знаходзілася ў баявой ахове, астатнія будавалі «саманы». Гліну размешвалі з саломай, у скрынях з-пад патронаў фармавалі вялікія цагліны, якія хутка высыхалі на сонцы. З іх ляпілі жыллё, бо армейскія палаткі былі ненадзейным сховішчам. Чатыры палаткі Пятра, напрыклад, ад варожых выстралаў згарэлі, як свечкі. А басмачы, так звалі тады нашы салдаты фарміраванні мусульманскіх экстрэмістаў, якія выступалі супраць урадавых войскаў Афганістана, абстрэльвалі размяшчэнне атрада з зайздросным пастаянствам, разлічваючы, напэўна, што нервы ў праціўніка не вытрымаюць і ён пакіне кропку. Стралялі днём, каб на сонцы не былі бачнымі ўспышкі выстралаў. У адказ байцы абрушвалі на засеўшых ў скалах басмачоў мінамётныя залпы і кулямётныя чэргі. Нязваныя госці хутка знікалі ў гарах.

Кропкі, накшталт Пашар, знаходзіліся ў гарах для перакрыцця караванных сцежак, па якіх з суседняга Пакістана на ішаках і пешым парадкам пастаўляліся зброя і ваенныя прыпасы для паўстанцаў. А таму Пятру пастаянна даводзілася ўдзельнічаць у засадах і так званых прачосках бліжэйшых кішлакоў (вёсак) у пошуках схованак зброі.

Мясцовае насельніцтва, якое ўпершыню бачыла ў сваіх мясцінах людзей еўрапейскай расы, было настроена варожа. У кішлаках, дзе назіралася страшэнная галеча, можна было сустрэць толькі жанчын, якія хаваліся за вугламі, басаногіх дзяцей і нямоглых старых. Дзе знаходзіліся працаздольныя мужчыны, адзін алах ведаў, хутчэй за ўсё ў радах басмачоў. Бедныя хаціны афганцаў дзяліліся на дзве палавіны – мужчынскую і жаночую, у якую чужым мужчынам забаранялася заходзіць, але насуперак шарыяту менавіта там і хавалася зброя: аўтаматы Калашнікава кітайскай вытворчасці, кулямёты ДШК, гранаты, карабіны яшчэ часоў другой сусветнай вайны, мінамёты. Падчас такіх прачосак нярэдка ўзнікалі перастрэлкі, у адной з якіх Пётр Кумпінь быў паранены ў нагу. На шчасце, рана была нязначнай, і пасля санчасці ён зноў вярнуўся ў строй. З поўнай баявой выкладкай і грузам боезапасу для кулямёта ўдзельнічаў у аперацыях у горнай мясцовасці. Часта такія аперацыі праводзіліся сумесна з урадавымі падраздзяленнямі, аднак на іх, дрэнна ўзброеных і абмундзіраваных, як кажуць, з міру па нітцы, апора

была слабая. Сёння такі баец «царандоя» (так называлася афганская паліцыя) з табой вітаецца, просіць закурыць, завярае ў сяброўстве, а заўтра, атрымаўшы ў рукі зброю, перабягае да басмачоў. Нездарма герой шырокавядомага фільма «Белае сонца пустыні» Сухаў гаварыў, што Усход – справа тонкая.

Нягледзячы на тое, што служба ішла ў экстрэмальных умовах і часта даводзілася тыднямі сядзець на сухім пайку, грызці сухары, пераносіць холад і спякоту, а пры гэтым рызыкаваць жыццём, з боку асабовага саставу ніколі не было нараканняў на службу. Часць Пятра Кумпіня складалася ў асноўным са славян: беларусаў, украінцаў і ў большай частцы рускіх сібіракоў. Два таджыкі былі ў якасці перакладчыкаў. Усе ўспрымалі выпаўшыя на іх долю выпрабаванні як свой грамадзянскі доўг перад Радзімай. Байцы верылі, што так трэба, паважалі і любілі свайго камандзіра маёра Канстанціна Тоцкага, які ніколі не падстаўляў іх пад варожыя кулі. Нездарма ён потым даслужыўся да пасады дырэктара ФСБ Расійскай Федэрацыі.

Так прайшло 20 месяцаў. Нарэшце 1 снежня 1987 года Пятра знялі з пазіцыі і даставілі ў г. Харог на Алтаі, дзе знаходзілася часць, куды ён прызываўся. Выдалі дакументы, бо ў Афганістане ўсе савецкія ваеннаслужачыя мелі толькі асабісты нумар, і абвясцілі дэмабілізацыю. Тры дні, пакуль чакалі лётнай пагоды, салдату здаліся даўжэй за ўсе месяцы, якія ён правёў на вайне, так хацелася трапіць хутчэй у родныя мясціны. Дамоў ветэран абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане вярнуўся 15 снежня. Спачатку Пётр Іосіфавіч працаваў шафёрам у калгасе, а цяпер на той жа самай пасадзе ў цэнтральнай аптэцы № 105. Жыве па-ранейшаму ў вёсцы Купчэлі, дзе ў мясцовай школе працуе жонка, а сын вучыцца ў Відзаўскім сельгасліцэі. Жыццё, як кажуць, увайшло ў трывалую каляіну, але афганскія ўспаміны трывожаць ветэрана, як быццам усё гэта было ўчора.

**М. Дзянісаў**